адміністрацыйнага падзелу. Пералічаныя функцыі характарызуюць Каардынацыйную Раду/Раду Дырэктараў (КР/РД) як своеасаблівыя дарадчыя органы пры мясцовых уладах з некаторымі рысамі лабісцкіх груповак. Гарантыяй супраць злоўжыванняў з іх боку з'яўляюцца 1) аўтарытэтнасць складу, 2) парытэтны прынцып фармавання, 3) перыядычная ратацыя кіраўніцтва, 4) удзел прадстаўнікоў мясцовай і рэспубліканскай улады, 5) абсалютная празрыстасць дзейнасці.

- Кожны са сцэнароў мае свае станоўчыя і адмоўныя бакі. У аптымістычным сцэнары КР здольная здзейсніць большы ўплыў на афіцыйную ўхвалу рашэнняў, у песімістычным сцэнары, РД і Агенцтва... больш незалежныя ад уладных структур.
- У абодвух сцэнарах структура КНА недзеяздольная без шырокай грамадскай падтрымкі.
- У абодвух сцэнарах КНА Прыбужжа з`яўляецца не альтэрнатывай, а партнэрам дзяржаўных органаў КНА ў дасягненні устойлівага развіцця у рэгіёне.
- На думку аўтара, існаванне сістэмы КНА Прыбужжа, створанага па тым ці іншым сцэнары, прывядзе да нейтралізацыі шкодных эфектаў галіновага прынцыпа прыродакарыстання і істотна ўмацуе пазіцыі органаў Мінпрыроды у рэгіёне.

Літаратура

1. Концепция Национальной стратегии устойчивого развития РБ — Мн.: Белсэнс, 1996 — 48 с.
2. Программа действий по охране окружающей среды для Центральной и Восточной Европы. — OECD and World Bank ISBN 963 8454 23 7, 1995 — 90 с.
3. Руководящие принципы комплексного управления природоохранной деятельностью в странах с экономикой переходного периода — Нью-Йорк: ООН, 1994 — 38.
4. Шимова О.С., Соколовский Н.К. Основы экономики природопользования — Мн.: НКФ "Экоперспектива", 1995 — 128 с.

## ПЕРСПЕКТЫВЫ АСАБЛІВА АХОЎНЫХ ПРЫРОДНЫХ ТЭРЫТОРЫЯЎ (ААПТ) У РЭГІЯНАЛЬНЫМ РАЗВІЦЦІ ПРЫБУЖЖА

*С.С. Валасюк*

*Брэсцкі політэхнічны інстытут, Рэспубліка Беларусь*

Дакладная геаграфічная дэфініцыя *Прыбужжа* адсутнічае — сам тэрмін мала ўжываецца ў навуцы. Тут пад Прыбужжам маецца на ўвазе рэгіён, які уключае прыгранічныя раёны Беларусі, Польшчы і Украіны, якія належаць да басейну Заходняга Бугу. Рэгіён Прыбужжа характарызуецца высокай ступенню захаванасці

натуральнага асяроддзя, выключным багаццем флоры, фауны і краявідаў, шчыльнымі гістарычна-культурнымі повязямі насельніцтва.

Цяперашнія крызісныя з’явы ў экономіцы спрычыніліся да пэўнага паляпшэння стану навакольнага асяроддзя Беларускага Прыбужжа і лакалізацыі крыніц экалагічнай пагрозы. Аднак, падобнае паляпшэнне, міма сваёй станоўчай ролі, супярэчыць сучаснаму экалагічнаму імператыву — *ідэі устойлівага развіцця*, якая грунтуецца на гарманічным паляпшэнні становішча адразу ў трох сферах — эканамічнай, сацыяльнай і экалагічнай. Таму актуальнай з`яўляецца праблема пошуку такіх мадэляў кіравання навакольным асяроддзем, якія б дазволілі сумясціць захаванне прыроднага багацця рэгіёну з ростам жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

Альтэрнатывай нізкаэкалагічным метадам гаспадарання з`яўляюцца *праэкалагічныя*, якія маюць наступныя характэрныя рысы:

- *біярэгіяналізм* — г.зн. усведамленне адзінства натуральнага асяроддзя і чалавечай супольнасці рэгіёну;
- прыярытэт прадухілення шкоды ў параўнанні з яе ліквідацыяй;
- мінімізацыя ціску антрапагенных інтэрвенцыяў на натуральнае асяроддзе;
- навуковы пралік экалагічных аспектаў гаспадарчай дзейнасці і, адпаведна, стратэгічнае планаванне характару і параметраў развіцця, якое вынікае адсюль;
- рэальная кампенсацыя антрапагеннага ціску на асяроддзе праэкалагічнымі мерапрыемствамі.

Неабходным элементам кіравання навакольным асяроддзем з’яўляюцца ААПТ, якія ва ўмовах рынкавай эканомікі набываюць новае значэнне — не толькі ў якасці рэзерватаў і рэгенератаў дзікай прыроды і цэнтраў навуковых даследаванняў, але і істотнага чынніка ўстойлівага развіцця рэгіёну, крыніцы прыцягнення інвестыцый і міжнароднай донарскай дапамогі, “прынады” для мас турыстаў, візітнай карткі рэгіёну. Аўтар перакананы, што належным чынам уладкаваныя ААПТ здольныя

- фінансава самазабяспечваць большы аб’ём сваёй практычнай і навуковай функцыяў, назапашваць сродкі для свайго развіцця;
- павялічыць занятасць насельніцтва, асабліва сельскага;
- прыносіць прыбыткі, якія мэтазгодна выкарыстоўваць у межах замкнёнай сістэмы на праэкалагічныя мэты ў тым ліку і на тэрыторыях, якія не маюць ахоўнага статусу;
- выступаць своеасаблівамі кропкамі росту для эка- і агратурыстычнай, інфармацыйнай, вытворчай інфраструктур па месцы знаходжання ААПТ;
- пры гэтым захоўваць сваю біятычную і ландшафтную разнастайнасць.

Беларускае заканадаўства прадугледжвае наступныя галоўныя формы ААПТ:

1. *Запаведнікі і нацыянальныя паркі* — ААПТ, якія характарызуюцца *поўнай альбо частковай забаронай гаспадарчай дзейнасці*, з’яўляюцца самастойнымі

юрыдычнымі асобамі, знаходзяцца ў веданні Ўпраўлення справамі адміністрацыі прэзідэнта.

2. *Заказнікі* рознага кшталту — ААПТ, на тэрыторыі якіх *забароненыя пэўныя віды гаспадарчай дзейнасці.* Яны не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі і знаходзяцца ў веданні асноўнага землекарыстальніка пад наглядам адпаведных органаў Мінпрыроды РБ.

Агульная плошча ААПТ Брэсцкай вобласці 267,8 тыс га, што складае 8,2% агульнай плошчы вобласці (6,4% — адпаведны паказчык па РБ) альбо 20% усіх ахоўных тэрыторыяў Беларусі, займаючы другое месца пасля Віцебскай. Працэнт ААПТ прыбужскіх раёнаў менш за рэспубліканскі — прыкладна 5,5%. Сярод іх Нацыянальны парк "Белавежская пушча" (3,8%), 8 з 19 заказнікаў рэспубліканскага: Буслаўка, Дзікае, Званец, Лукава, Міхалінска-Бярозаўскі, Радастаўскі, Ружанская Пушча, Селяхі і 15 з 31 мясцовага значэння.

Для паспяховай інтэграцыі ААПТ у сучасную сістэму кіравання навакольным асяроддзем Прыбужжа неабходная рэалізацыя мерапрыемстваў па наступных накірунках:

1. Навуковыя даследванні, звязаныя з выяўленнем бяспечнай для натуральнага асяроддзя існуючых ААПТ, асабліва заказнікаў, ступені антрапагеннай прэсіі, звязанай з турызмам, традыцыйным земляробствам і рамёствамі, лясной гаспадаркай.
2. Правядзенне, там дзе гэта неабходна, занавання ААПТ з выдзяленнем зон пільнай аховы, зон аховы краявідаў і рэкрэацыйна-гаспадарчых зон (паводле G. Rąkowskiego), стварэнне інфраструктуры эка- і агратурызму — экалагічных сцежак, палатачных палёў і пляцовак і г.д.
3. Стварэнне сеткі структур, адказных за эксплуатацыю і абслугоўванне ААПТ, у тым ліку экспартная арыентацыя інфраструктуры традыцыйнага турызму, стварэнне турыстычных служб у структуры асноўных землекарыстальнікаў, арганізацыя агратурыстычных гаспадарак, прыцягненне структур грамадзянскай супольнасці для судзеяння экатурызму і г.д.

На асабліва пільную ўвагу заслугоўвае стварэнне экалагічнага калідору ракі Буг, як часткі еўрапейскіх экалагічных сетак ECONET і Natura 2000. Стрыжнем падобнага калідору маглі б стаць праектаваныя *трансгранічныя ААПТ*, на базе існуючых (гл. Малюнак 1). Магчымасць наведавання натуральных комплексаў па абодвух берагах Бугу, забяспечаная *спецыяльным рэжымам перасячэння мяжы*, будзе дадатковай атракцыяй для турыстаў, а *трансгранічная каардынацыя дзейнасці па кіраванні навакольным асяроддзем* дазволіць захаваць і эфектыўна выкарыстоўваць натуральныя багацці Прыбужжа.




Малюнак 1. Праектаваныя трансгранічныя ААПТ у межах экалагічнага калідору р. Буг (паводле Grzegorza Rąkowskiego)

**Літаратура:**


1. Andrzej Miszczuk. Agroturystyka jako Czynnik Rozwoju Obszarów Polskiej Części Euroregionu Bug // Euroregion Bug — Lublin: Norbertinum — tom 3 — 1996 — 188.
2. Особо охраняемые природные территории Брестской области — Брест: БрГУ, Областной Комитет ПР и ООС, 1997 — 148 с.
3. Grzegorz Rąkowski. Transgraniczne Obszary Chronione w Obrębie Euroregionu Bug // Euroregion Bug — Lublin: Norbertinum — tom 3 — 1996 — 188.
4. Tetiana Andrejenko et al. Programy ochrony przyrody w terenach przygranicznych zachodniej Ukrainy // Bug — Europejski Korytarz Ekologiczny, Lublin: KUL, 1999.
5. З.Ф. Муравьёв. Буг — в экологической политике Беларуси // Bug — Europejski Korytarz Ekologiczny, Lublin: KUL, 1999.


## О МЕЖРЕГИОНАЛЬНОМ СОТРУДНИЧЕСТВЕ


*Г.С.Хмельницкая*

*Могилевский машиностроительный институт, Республика Беларусь*


Экономическая интеграция Беларуси и Российской Федерации направлена на использование преимуществ межгосударственного разделения труда, специализации и кооперирование.